П. М. Ігнацьева быў распрацаваны праект рэформы сістэмы адукацыі, у якім прадугледжвалася, што абноўленая школа павінна быць «нацыянальнай» і садзейнічаць выхаванню ў вучняў агульнарасійскай нацыянальнай самасвядомасці. У вучэбных планах дамінавала руская мова, літаратура, гісторыя і геаграфія Расіі. Тым не менш нярускім народам планавалася магчымасць вывучэння, у тым ліку і ў сярэдняй школе, культурнай спадчыны сваіх народаў. Але П. Ігнацьеў быў вымушаны пайсці ў адстаўку, і яго праекты засталіся толькі ў планах.

У жніўні 1914 г. пры абмеркаванні бюджэту Міністэрства народнай асветы ў IV Дзяржаўнай думе ксёндз С. Г. Мацэевіч зноў узняў пытанне аб стане адукацыі ў Віленскай навучальнай акрузе. Ён указаў на імкненне мясцовага кіраўніцтва да моўнай русіфікацыі ўсяго навучальнага працэсу, уключна з выкладаннем Закона Божага, і адзначаў, што ахвярамі гэтай палітыкі былі не толькі палякі, але і літоўцы, латышы, беларусы, украінцы. С. Мацэевіч імкнуўся пераканаць дэпутатаў у неабходнасці павялічыць фінансаванне агульнаадукацыйных школ і крытыкаваў прапановы крайне правага дэпутата Г. Г. Замыслоўскага (Віленская губерня) аб неабходнасці ўзмацнення выдаткаў на дзейнасць царкоўнапрыходскіх школ[1].

У першае дзесяцігоддзе XX ст. улада вылучалася кампраміснасцю сваёй палітыкі  і курсам на завяршэнне дзяржаўнай еўрапеізацыі краіны. Аб гэтым сведчылі Маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г., скліканне Дзяржаўнай думы, палітычныя рэформы ў органах кіравання, сферы школьнай адукацыі, змены ў аграрным, рабочым і нацыянальным пытаннях. Пры П. Сталыпіне палітыка лавіравання практычна вызначала сутнасць усяго ўнутрыпалітычнага кірунку царскага ўрада. Кіруючыя колы разумелі непазбежнасць новай рэвалюцыі і прымалі меры, якія, на іх погляд, маглі спыніць рух краіны да рэвалюцыйнай катастрофы. Першым крокам у гэтым напрамку стала замена выбарчага заканадаўства («Положение о выборах в Государственную Думу» ад 6 жніўня 1905 г.; указ ад 11 снежня 1905 г.; выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г.). Аграрная, земская, рабочая і іншыя рэформы, якія праводзіліся ўрадам П. Сталыпіна ў 1907–1914 гг., былі палітычна арыентаваныя, асабліва ў інтарэсах урадавай апоры – праўрадавых партый.

## 4.4. Дзейнасць палітычных партый у 1907–1914 гг.

***Манархічныя партыі і арганізацыі.*** У другой палове 1907 г. у цэнтры ўвагі ўсіх палітычных сіл і партый Расійскай імперыі былі адносіны да выбарчай кампаніі ў III Дзяржаўную думу. Савет аб'яднанага дваранства – галоўная партыя кансерватараў – накіроўваў перадвыбарчую дзейнасць усіх манархічных партый і арганізацый. 17–19 чэрвеня 1907 г. праходзіў усерасійскі з'езд

[1] Смалянчук А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864–1917 гг. – Гродна, 2001. – С. 201.

прадстаўнікоў губернскіх аддзелаў «Союза русского народа» і іншых манархічных арганізацый. З'езд пастанавіў: разаслаць усім аддзелам на месцах прынятую перадвыбарчую платформу. У ёй падкрэслівалася, што Дума павінна быць супраць усякіх абмежаванняў самадзяржаўнай улады і рускай народнасці і абавязкова «национально-русской». Для гэтага, падкрэслівалася ў адозве, ва ўсіх губернях і паветах «Союз русского народа» і іншыя правыя арганізацыі павінны правесці сваіх кандыдатаў у Думу самастойна і ні з якімі палітычнымі партыямі, якія імкнуцца да «канстытуцый» і раўнапраўя яўрэяў, у пагадненні не ўступаць. Мясцовым аддзелам лідары «Союза русского народа» раілі весці агітацыю ў корчмах і чайных, дзе збіраецца шмат людзей, выкарыстоўваючы пры гэтым асоб з «известными» аратарскімі здольнасцямі. Важнае значэнне надавалася распаўсюджванню агітацыйнай літаратуры: брашур, праграм, заклікаў, якія павінны былі друкавацца на месцах ці выпісвацца непасрэдна са сталіц і буйных гарадоў.

Сталічныя кіраўнікі «Союза русского народа» выпрацавалі праект выбарчай платформы для манархічных арганізацый СРН і РОС Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, Ковенскай губерняў і Царства Польскага. Нічым істотным ад агульнарасійскай платформы ён не адрозніваўся, акрамя таго, што шавінізм праяўляўся больш яскрава ў патрабаванні весці ўзмоцненую барацьбу з палякамі і яўрэямі, і дакладна быў указаны паплечнік для мясцовых аддзелаў «Союза русского народа» ў ходзе выбарчай кампаніі – праваслаўныя брацтвы[1]. Больш чым іншыя правыя партыі, «Союз русского народа» рабіў стаўку на «чарнасоценны дэмакратызм» і таму ўключаў у свой склад разам з землеўласнікамі, купцамі і духавенствам таксама прадстаўнікоў паліцыі і нават былыя крымінальныя элементы.

Арганізацыі СРН, РОС існавалі ва ўсіх губернскіх і амаль ва ўсіх павятовых гарадах і шматлікіх мястэчках беларуска-літоўскіх губерняў. Яны актыўна дапамагалі адміністрацыі і паліцыі рыхтаваць і праводзіць выбары. Тым больш, што ў дапамогу з Пецярбурга былі накіраваны інструктары, якія кіравалі агітацыяй на месцах. Кур'еры У. М. Пурышкевіча і А. І. Дубровіна былі і ў гэтых губернях. Так, у Пінску вёў актыўную перадвыбарчую агітацыю, распаўсюджваў літаратуру пагромнага зместу сакратар У. Пурышкевіча І. Астроўскі[2]. Ён так энергічна выконваў ускладзеную на яго місію, што мясцовая паліцыя мусіла прыцягнуць яго да адказнасці за ўдзел у пагроме.

Да актыўнай перадвыбарчай дзейнасці прыступілі мінскія чарнасоценцы, якіх узначальваў лідар «истинно-русских» у Заходнім краі Г. К. Шмід. У адкрытым лісце да выбаршчыкаў Мінскай губерні яны спасылаліся на «польскую» і «еврейскую» небяспеку, заклікалі да яднання і абароны «русских»

[1] На собрании членов Витебского отдела «Союза русского народа» // Витеб. губерн. ведомости. – 1907. – 14 авг. – С. 2.

[2] Пинск // Северо-западный голос. – 1907. – 2 авг. – С. 3.

інтарэсаў на месцах і ў будучай Думе. Заклік завяршаўся словамі: «Прадстаўнікі вашы павінны працаваць у Думе разам з урадам, а не з трудавікамі і рэвалюцыянерамі»[1]. Шырокую агітацыю праводзіў Гомельскі аддзел «Союза русского народа», адным з лідарам якога быў А. Давыдаў. У жніўні 1907 г. ён наладзіў чарнасоценныя сходы ў Магілёве, Віцебску і іншых гарадах[2].

28–31 жніўня 1907 г. у Мінску адбыўся першы з'езд заходнярускіх брацтваў, на якім праваслаўнаму духавенству ў якасці галоўнай задачы было пастаўлена далучэнне народа да царкоўнага жыцця і яднанне яго ў брацкія саюзы. Мікалай II асабіста вітаў удзельнікаў з'езда тэлеграмай.

Лідары «Российского окраинного союза» праз газеты «Новое время», «Окранны России», «Минское слово», «Могилевскнй вестник», «Губернские ведомости», «Полоцкне епархиальные ведомости», часопіс «Крестьянин» і іншыя выданні патрабавалі русіфікацыі заходніх губерняў, абвяшчаючы лозунг «Единой, нераздельной России».

Праўрадавым партыям беларуска-літоўскіх губерняў ва ўмовах наступлення контррэвалюцыі і рэакцыі пры дапамозе новага выбарчага закона, асабліва ў дачыненні заходніх губерняў, умяшання мясцовых улад у справу выбараў, удалося правесці ў Думу 80,5 % дэпутатаў, у той час як па Расіі ў цэлым – 61,5 %. Можна зрабіць выснову, што ў заходніх губернях уплыў правых партый на выбаршчыкаў, асабліва сялян, быў больш значным, чым у цэлым па Расійскай імперыі. Палітыка царызму ў заходніх губернях пашырыла магчымасці правых у іх дзейнасці.

Як і ў папярэдніх скліканнях, у III Думе важнейшым з пытанняў грамадска-палітычнага жыцця краіны было аграрнае. Але чарнасоценна-акцябрысцкая Дума звяла аграрнае пытанне толькі да абмеркавання ўказа ад 9 лістапада 1906 г. Правыя дэпутаты ад 5 заходніх губерняў – епіскап Гомельскі Мітрафан, протаіерэй Ф. І. Нікановіч, В. К. Тычынін – як і прадстаўнікі галоўных манархічных партый Расійскай імперыі, лічылі ўказ адзіным сродкам вырашэння аграрнага пытання і прадухілення рэвалюцыі. Іх падтрымлівалі акцябрысцка-манархічныя газеты, якія выходзілі ў беларуска-літоўскіх губернях.

Падрыхтоўка да выбарчай кампаніі ў IV Дзяржаўную думу праходзіла ў перыяд пералому агульнапалітычнай сітуацыі ў краіне. У пачатку 1912 г. у Пецярбургу было створана «Западнорусское общество», якое ставіла за мэту садзейнічанне ўмацаванню рускай культуры і развіццю духоўных і матэрыяльных сіл рускай народнасці ў Заходнярускім краі і вывучэнне яго сучаснага і мінулага становішча. Старшынёй быў абраны дэпутат III Думы, камергер двара Мікалая II, сакратар фракцыі рускіх нацыяналістаў памяркоўна правы ў IV Думе Д. М. Чыхачоў. У склад таварыства ўвайшлі члены Дзяржаўнага са-

[1] Столыпин П. А. Сборннк речей, произнесенных в заседаниях Государственной думы (1906–1911). – СПб., 1911. – С. 131.

[2] Витебск. Сообщенне кореспондента // Северо-западный голос. – 1907. – 20 сент. – С. 3–4.

вета Д. І. Піхно, Я. Н. Афросімаў і член ІІ Думы В. В. Шульгін. Аддзяленне «Западнорусского общества» было адкрыта ў Вільні[1].

«Западнорусское общество» ў першую чаргу мела на мэце абарону правоў рускага народа ў супрацьстаянні з палякамі і яўрэямі ў перыяд выбараў. Яно было заклікана падтрымаць на тэрыторыі Беларусі і Украіны «истинно-русские» сілы, аб'яднаныя вакол газеты «Окраины России» і часопіса «Киевлянин» (рэдактар Д. Піхно), якія патрабавалі, каб іншародцы не пагражалі адзінству Расійскай імперыі. У пяці заходніх губернях больш за 70 прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства, грамадскіх дзеячаў, публіцыстаў, ваенных асоб падтрымлівалі газету «Окранны Россин» матэрыяльна[2].

У выбарчую кампанію актыўна ўключыўся Св. Сінод. Па епархіях былі разасланы сакрэтныя інструкцыі аб кіраўніцтве вясковым духавенствам у справе выбараў у Думу на ўсіх стадыях у адпаведнасці з меркаваннямі мясцовых губернскіх начальнікаў.

У час выбараў у ІІ і ІІІ Думы «просеиваннем» выбаршчыкаў і актывізацыяй чарнасоценцаў у Мінскай губерні займаўся архіепіскап Мінскі і Тураўскі Міхаіл. Пасля яго смерці (28 мая 1912 г.) Св. Сінодам у чэрвені старшынёй губернскага рускага перадвыбарчага камітэта быў прызначаны епіскап Іаан. У пачатку чэрвеня ён правёў аб'яднаны сход саветаў галоўных мінскіх «русских» груповак і арганізацый: Народнага брацтва Святога Крыжа, Магілёўскага брацтва, СРН і Барысаўскага аддзела нацыянальнага саюза. Аднагалосна былі прыняты асноўныя аб'яднальныя палажэнні: праваслаўе, самадзяржаўе, руская народнасць і недапушчэнне блокаў з «инородцами». А 9 верасня пад старшынствам епіскапа Іаана, пры ўдзеле прадстаўнікоў земстваў і ўсіх манархічных груповак, адбыўся чарговы сход, на якім аб'яднаным Саветам усіх правых арганізацый былі прапанаваны кандыдатамі ў выбаршчыкі па Мінску мінскі павятовы прадвадзіцель дваранства С. М. Сорнеў і член СРН А. Глінка[3].

У самы разгар выбарчай кампаніі выйшаў першы нумар штодзённай газеты вялікадзяржаўнага кірунку «Витебский вестник». Яе рэдактарамі былі А. А. Ляхвіцкі, П. В. Кудраўцаў, М. М. Сталеўскі, У. І. Медзякоў. Газета выдавалася на ўрадавыя сродкі і аб'ядноўвала вакол сябе мясцовых актывістаў СРН і правых акцябрыстаў.

Сведчаннем складанай сітуацыі ўрада з'явілася дэкларацыя, з якой 5 снежня 1912 г. у Думе выступіў прэм'ер-міністр і міністр фінансаў У. М. Какоўцаў. Дэкларацыя адлюстроўвала імкненні пазбегнуць дакладна вызначанага ўрадавага курсу пры агульным далейшым скіраванні ўправа. Прэм'ер-міністр адзначыў, што дзейнасць Думы павінна быць накіравана на пошукі шляхоў па ажыццяўленні Маніфеста ад 17 кастрычніка, але тут жа патрабаваў ахоўваць

[1] Акнмов С. Западио-русское общество // Крестьяннн. – 1912. – 6 февр. – С. 2–5 (81–85).

[2] Кулаковский П., Бывалькевнч П. Редакционная семья: слово к читателям // Окраины России. – 1912. – 22–29 дек. – С. 1–5.

[3] Провннцня. Телеграммы наших корреспондентов // Речь. – 1912. – 13 сент. – С. 4.

інтарэсы рускай дзяржаўнасці, адзінства і непадзельнасці імперыі, першынство ў ёй рускай народнасці і праваслаўнай веры[1].

Мінскі епархіяльны місіянер К. М. Акаловіч не пагадзіўся з прэм'ер-міністрам. Ён указаў на вялікую небяспеку з боку палякаў, якія сістэматычна захопліваюць у заходніх губернях лясы і зямлю, а таксама яўрэяў, што ў сваіх руках трымаюць і капітал, і гандаль, і друк, і адзначыў, што жыццё праваслаўнага чалавека тут немагчыма. Нават цвёрдыя ў веры стараабрадцы – і тыя пакідаюць у краі землі і едуць у Сібір, каб не бачыць сыходзячай крывёю сваю жывёлу, якая вяртаецца з палёў з адкручанымі хвастамі і выразанымі на скуры чатырохканцовымі польскімі крыжамі. Заклікаючы ўрад да рашучых дзеянняў супраць палякаў і яўрэяў у Заходнім краі, К. Акаловіч заявіў, што «мы не можам далей жыць і чуць песню, што яшчэ Польшча не згінэла і не згіне яшчэ москаль, у паляка будзе пасвіць свіней»[2].

Знішчальнай крытыцы падверглі ўрадавую дэкларацыю рускія нацыяналісты. Яны былі незадаволены прэм'ер-міністрам за недастатковую, з іх пункта гледжання, актыўнасць у наступленні на «инородцев» і за Балканскі крызіс. Галоўная прэтэнзія заключалася ў тым, што ўрад не працягваў палітычнага курсу П. Сталыпіна.

***Кадэты і прагрэсісты.*** У міжрэвалюцыйны перыяд у крызісным стане апынуліся кадэты. Іх нешматлікія аддзелы засталіся ў Вільні, Мінску і Віцебску. Гэты факт канстатаваў у выніку паездкі па заходніх губернях А. Р. Лядніцкі, адзін з заснавальнікаў канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі (КДП), член яе ЦК, дэпутат І Дзяржаўнай думы[3]. Кіраўніцтва партыі і асабліва яе правае крыло зыходзіла з таго, што перспектыва рэвалюцыі на бліжэйшы час знята, а правядзенне рэформ можа прыпыніць новы рэвалюцыйны выбух.

10–11 чэрвеня 1907 г. адбылося пленарнае пасяджэнне ЦК КДП, прысвечанае пытанню аб магчымасці ўдзелу кадэтаў у выбарах у Думу. Прадстаўнік ад Вільні Э. Ром заявіў, што ў ІІІ Думе мы не павінны апынуцца ў тым становішчы, у якім былі ў ІІ Думе сацыял-дэмакраты, таму найлепшым выхадам з'яўляецца байкот[4]. Але хутка пазіцыі вярхоў канстытуцыйных дэмакратаў дакладна вызначыліся, і ЦК звярнуўся з адозвай да мясцовых арганізацый, даючы ім парады весці барацьбу супраць байкоту і ісці на выбары з праграмай, вылучанай у ІІ Думе. Кадэцкія лідары рашуча вызначылі мяжу, якая аддзяляла лібералаў ад левых партый. П. М. Мілюкоў адзначыў, што «ў Расіі, як і ў нас, ёсць ворагі злева». Такімі ворагамі, на яго думку, былі бальшавікі і анархісты. У звароце ЦК партыі заяўлялася, што мясцовыя арганізацыі не павінны шукаць саюзнікаў

---

[1] Государственная дума. Стенографические отчеты. VIII сессия (1912–1913). – СПб., 1912–1913. – С. 205.

[2] Государственная дума. Стенографические отчеты. VIII сессия ... – С. 880–884.

[3] ДАРФ. – Ф. 523. Воп. 1. Спр. 13. Арк. 19, 28–31.

[4] Протоколы Центрального комитета и заграничных групп конституционно-демократической партии, 1905 – середина 1930-х гг. : в 6 т. – М., 1994. – Т. 1. – С. 205.

ні злева, ні справа. Групам, якія існавалі ў Мінску, Вільні, Віцебску, прапаноўвалася заключаць блокі з польскімі і яўрэйскімі нацыянальнымі групамі. Аднак на заключнай стадыі выбараў не быў знойдзены кампраміс паміж Э. Ромам і кандыдатам ад Яўрэйскага выбарчага камітэта ў Вільні А. В. Грузенбергам. А дэпутатам ад «русской» курыі стаў намеснік пракурора Віленскай судовай палаты, член СРН Г. Г. Замыслоўскі.

Настроі ліберальных колаў адлюстроўвала газета «Окраина». Яе першы нумар выйшаў 30 чэрвеня 1907 г. У лісце паліцмайстра Мінскаму губернатару паведамлялася, што газета будзе выдавацца групай мясцовых каталікоў на чале з ксяндзом С. Міхалькевічам[1]. Асноўную ўвагу «Окраина» сканцэнтравала на барацьбе з мясцовымі чарнасоценнымі арганізацыямі і іх органамі друку, выступала ў абарону палякаў і яўрэяў. У жніўні ў Мінску адбыўся перадвыбарчы з'езд «рускіх» землеўласнікаў, якія знаходзіліся пад уплывам кадэтаў. У катэгарычнай форме ўдзельнікі з'езда выступілі супраць усялякіх блокаў з правымі. Але большасць буйных «рускіх» памешчыкаў дзейнічалі ў губерні разам з «крайне правымн» і праваслаўнымі свяшчэннікамі, што і вызначыла палітычны склад дэпутатаў Думы ад Міншчыны. Намаганнямі мясцовых адміністрацый Віцебскай і Магілёўскай губерняў удзел канстытуцыйных дэмакратаў у выбарчай кампаніі быў фактычна сарваны[2].

III Дзяржаўная дума пачала сваю працу 1 лістапада 1907 г. у Пецярбургу. У снежні адбыўся судовы працэс па справе дэпутатаў I Дзяржаўнай думы, якія паставілі подпісы пад Выбаргскай адозвай. Ад заходніх губерняў з ліку кадэтаў па справе праходзілі: грамадскі равін, рэдактар штодзённай газеты «Втебская жизнь» Р. Я. Брук, старэйшы гласны Віцебскай гарадской думы А. А. Валковіч; член цэнтральнага бюро расійскай сіяністскай арганізацыі, былы грамадскі равін у Гродна Ш. Х. Левін (Віленская губерня); памочнік прысяжнага паверанага ў Магілёве Р. М. Цвёрды; ганаровы міравы суддзя, магілёўскі земскі гласны А. Я. Хамянтоўскі; адвакат, член маскоўскага савета прысяжных паверанных А. Р. Лядніцкі; лідар сіяністскага руху ў Расіі, прысяжны павераны С. Я. Розенбаўм (Мінская губерня). Суд прыгаварыў абвінавачаных да трох месяцаў турэмнага зняволення і пазбаўлення выбарчых правоў[3].

У складаных для сябе палітычных умовах галоўным зместам працы кадэтаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі заходніх губерняў, стаў удзел у з'ездах, канферэнцыях, сходах, якія наладжваў ЦК партыі: 24–27 лістапада 1907 г. V з'езд КДП у Гельсінгфорсе; сход кадэцкай фракцыі III Дзяржаўнай думы з прадстаўнікамі тэрытарыяльных груп 1–2 мая 1908 г.; сход прадстаўнікоў фракцыі з дэпутатамі ад мясцовых груп 20–21 кастрычніка 1908 г. і інш. Практычна ва ўсіх пералічаных форумах прымаў удзел Э. Ром. Кадэты вызначылі сваю палітыч-

[1] Вильно. Партийная жизнь // Северо-западный голос. – 1907. – 17 авг. – С. 4.
[2] Витебск // Наша Ніва. – 1907. – 26 кастр. – С. 4.
[3] Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі. – С. 66–74.

ную лінію, згодна з якой Дума павінна з'яўляцца кафедрай для абвяшчэння прынцыпаў і крытыкі існуючага ладу, накіроўваць насельніцтва на барацьбу з урадам, садзейнічаць набліжэнню рэвалюцыі, не апускаць сцяг перад левымі партыямі, але і не адштурхоўваць іх, паколькі яны дапамогуць у будучым стварыць большасць у Думе пры новым выбарчым законе[1].

У мэтах каардынацыі барацьбы розных нацыянальных партый і груповак у барацьбе супраць царызму кадэты на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў выкарыстоўвалі палітычнае масонства. У 1910 г. у Вільні была заснавана масонская ложа «Еднасць». Ролю арганізатара адыгралі браты Е. і Э. Ромы. У ліку заснавальнікаў былі таксама І. І. і А. І. Луцкевічы[2].

Браты Ромы дапамагалі беларускім палітычным дзеячам наладзіць сувязі з кіраўнікамі КДП і, у прыватнасці, з П. Мілюковым. А. Луцкевіч стаў карэспандэнтам кадэцкай газеты «Речь». У нумары за 1 чэрвеня 1911 г. быў надрукаваны яго артыкул «Вынікі і перспектывы "нацыянальнай" палітыкі ў Беларусі». Аўтар шукаў падтрымкі ў грамадскасці ў справе ўвядзення беларускай мовы замест рускай у каталіцкім набажэнстве. А. Луцкевіч лічыў, што спробы гвалтоўнага выцяснення польскай мовы з касцёлаў толькі ўмацоўваюць да яго сімпатыі мясцовага насельніцтва і за такі клопат «абаронца» беларусаў ад паланізацыі П. Сталыпін падтрымкі не знойдзе. «Выратуй нас, Божа, ад сяброў, а ад ворагаў мы і самі пазбавімся», – з такімі словамі выступаў ад імя беларусаў А. Луцкевіч[3].

З крытычных пазіцый выказваўся аб спробах царскага ўрада перавесці каталіцкае набажэнства ў Паўночна-Заходнім краі на рускую мову А. Луцкевіч і ў лісце да П. Мілюкова ад 17 чэрвеня 1911 г.[4] У наступным пісьме ён прасіў лідара кадэтаў выступіць у абарону газеты «Наша Ніва»[5]. Можна зрабіць выснову, што з дапамогай палітычнага масонства лібералы, у прыватнасці кадэты, імкнуліся актывізаваць грамадскае жыццё, асабліва ў сувязі з выбарамі ў IV Дзяржаўную думу.

Выбарчая платформа кадэтаў была падрыхтавана П. Мілюковым і прынята на чарговай канферэнцыі партыі ў маі 1912 г. У платформе вызначаліся галоўныя палажэнні, правядзення якіх кадэты планавалі дабівацца, а менавіта – дэмакратызацыя выбарчага закона, карэнная рэформа Дзяржаўнага савета і фарміраванне адказнага думскага міністэрства. У аграрным пытанні кадэты выступалі за вызваленне сялянства ад апекі ўрада і дваранства ў асобе земскіх

---

[1] Документы общероссийских партий и организаций либерального направления в Беларуси (1905–1918 гг.). – С. 194–195.

[2] Вольныя муляры ў беларускай гісторыі, канец XVIII – пачатак XX ст. – Вільня, 2005. – С. 161–165.

[3] Документы общероссийских партий и организаций либерального направления в Беларуси (1905–1918 гг.). – С. 198–201.

[4] Там же. – С. 198.

[5] Там же. – С. 202.

начальнікаў. У жніўні 1912 г. выбарчая платформа была надрукавана, але п ліцыя яшчэ ў друкарні канфіскавала ўвесь тыраж.

На пасяджэнні Санкт-Пецярбургскага гарадскога камітэта КДП П. Мілн ковым былі агучаны парады мясцовым партыйным групам Паўночна-Заходнял краю падчас выбарчай кампаніі. Сутнасць зводзілася да таго, што неабходн выступаць не пад кадэцкімі сцягамі, а садзейнічаць вылучэнню ў Думу пра грэсіўна настроеных дзеячаў, якіх маглі падтрымаць прадстаўнікі розных на цыянальнасцей (з якімі планавалася знайсці паразуменне з пачаткам думскі пасяджэнняў). Прапановы П. Мілюкова і кіраўнікоў Санкт-Пецярбургскаг бюро прагрэсістаў І. М. Яфрэмава і М. М. Львова, а таксама заклікі маскоўскі прагрэсістаў, змешчаныя ў іх органах друку газетах «Утро России», «Русско слово» і іншых, не засталіся без увагі. Кадэцкая група Вільні (адзін з кіраўні коў – доктар Л. Выгоцкі) прыступіла да фарміравання губернскага выбарчага блока, у які ў першую чаргу павінны былі ўвайсці прагрэсісты. Паводле звестак «Речи», гурток прагрэсістаў узнік у Вільні ў студзені 1912 г.[1]

На Гродзеншчыне камітэт прагрэсістаў быў заснаваны ў Брэст-Літоўску[2]. Шматлікія сходы прагрэсістаў, арганізаваныя Мінскім камітэтам, прайшлі 7 і 15 верасня[3]. Дэпутатам Думы ад Гродзенскай губерні быў абраны адзіны прагрэсіст ад 5 заходніх губерняў ляснічы Пружанскага павета В. А. Біч. У Думе ён падтрымліваў агульную платформу прагрэсістаў, але некалькі адступаў ад пазіцый гэтай партыі па аграрным пытанні, імкнуўся ажыццяўляць інтарэсы мясцовых беларускіх сялян, выхадцам з якіх ён быў. В. Біч склаў табліцу, якая адлюстроўвала размеркаванне зямельных участкаў паміж сем'ямі сялян у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні. Выкарыстоўваючы свае падлікі, аўтар паказаў, што ўрадавыя меры не змогуць палепшыць становішча сялян, таму што яны не валодаюць нават мінімумам зямлі, неабходным для вядзення гаспадаркі[4].

У вырашальны час выбарчай кампаніі ў IV Думу ў 1912 г. віленскія лібералы пачалі выданне «Вечерней газеты». Яе фактычным рэдактарам быў А. Луцкевіч. Палітычная платформа, па сутнасці, базіравалася на праграме КДП, але ў газеце знайшлі адлюстраванне і мясцовыя асаблівасці – у прыватнасці «краёвая» ідэалогія. Палітычная платформа, надрукаваная ў першым нумары ад 18 верасня, завяршалася словамі: «Свядомасць, што мы пражываем на гэтай зямлі, становімся грамадзянамі краю, – вось наша зыходная кропка пры высвятленні патрэб розных груп яго насельніцтва»[5].

---

[1] Вишиевски Э. Либеральная оппозиция в России накануие Первой мировой войны. – М., 1993. – С. 76, 189.

[2] Провинция. Телеграммы корреспондентов // Речь. – 1912. – 13 сент. – С. 4.

[3] Хроника событий // Речь. – 1912. – 8 сент. – С. 6.

[4] Государственпая дума. Стенографические отчеты. Созыв III. Сессия II. – СПб., 1908–1909. – С. 258–260.

[5] Докумеиты общероссийских партий и организаций либерального направления в Беларуси (1905–1918 гг.). – С. 203–204.

У Мінскай губерні ў 1912 г. пачала выдавацца «Минская русская газета». Мясцовыя лібералы па нацыянальным пытанні вылучылі патрабаванне – забеспячэнне патрэб нацыянальных меншасцей і захаванне іх своеасаблівасцей, рэформа дзяржаўнага ладу, усеагульнае выбарчае права ў органы мясцовага самакіравання, адмена «Положения об усиленной и чрезвычайной охране». Кандыдатам у дэпутаты быў вылучаны І. І. Метлін[1].

Асаблівасцю выбарчай кампаніі было аслабленне пазіцый кадэтаў. Верагодна, прычынай гэтага было ўсведамленне іх выбаршчыкамі немагчымасці вырашыць парламенцкім шляхам галоўныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця.

Зніжэнне актыўнасці і ўплыву на масы з боку кадэтаў было кампенсавана энергічнай перадвыбарчай дзейнасцю камітэтаў прагрэсістаў, асабліва на Гродзеншчыне і Міншчыне. Яны значна паўплывалі на вынікі выбараў, асабліва па гарадскіх курыях. У выніку ад 5 заходніх губерняў было абрана 108 выбаршчыкаў (у час выбараў у III Думу іх налічвалася 77). Прычым у Віленскай губерні польскія прагрэсісты мелі вырашальную ролю ў выбарах сярод насельніцтва «нерусской» курыі.

У фракцыю прагрэсістаў у IV Дзяржаўнай думе ўвайшоў дэпутат ад Гродзенскай губерні, член гродзенскага акруговага суда Ф. І. Лашкейт. Увосень 1913 г. ішлі перамовы паміж кадэтамі (59 дэпутатаў) і прагрэсістамі (48) з мэтай ліквідаваць раздробленасць апазіцыі. 11 кастрычніка кадэцкая «Речь» паведамляла, што партыі вызначыліся ў прызнанні неабходнасці апазіцыйнай барацьбы на глебе ажыццяўлення абяцанняў 17 кастрычніка. Аднак мелася істотная розніца ў тактыцы барацьбы. Газета пісала, што прагрэсісты добрыя людзі, якія жадаюць мірнага абнаўлення, інтуітыўна пазбягаючы непрымірымых супярэчнасцей і бязвыхадных сітуацый. Частка кадэтаў падтрымлівала прагрэсісцкія планы эвалюцыйнай перабудовы краіны. Лідар жа партыі кадэтаў П. Мілюкоў прытрымліваўся лозунга «изоляции правительства». Спробы старшыні Савета міністраў І. Л. Гарамыкіна знайсці падтрымку сярод дэпутатаў Думы не ўдаліся. Напярэдадні Першай сусветнай вайны расло адчужэнне паміж імператарскім дваром і яго сацыяльнай апорай – дваранствам. Імперыя знаходзілася ў стане палітычнага крызісу.

У перыяд 1907–1914 гг. кадэцкія аддзелы, якія дзейнічалі ў заходніх губернях, уяўлялі сабой нязначныя па колькасці аб'яднанні радыкальнай інтэлігенцыі, да якіх далучалася невялікая група землеўласнікаў. Мясцовыя кадэты па прычыне наяўнасці сярод іх значнай колькасці яўрэяў, незадаволеных нявырашанасцю яўрэйскага пытання ў імперыі, як і раней выступалі з больш левых пазіцый, чым КДП іншых рэгіёнаў З мэтай каардынацыі дзейнасці апазіцый-

---

[1] Документы общероссийских партий и организаций либерального направления в Беларуси (1905–1918 гг.). – С. 206; Метлін І. І. – прысяжны паверaны, грамадскі дзеяч. У час выбараў у IV Думу абапіраўся на мінскіх лібералаў і памяркоўных кансерватараў; у 1917 г. – камісар Часовага ўрада ў Мінскай губерні.

ных сіл кадэты выкарыстоўвалі і масонскую арганізацыю, праз якую аказвалі падтрымку беларускім грамадскім дзеячам. Але ўзмацненне кантролю з боку рэгіянальных улад, аслабленне ўплыву ў масах рэзка знізілі эфектыўнасць дзейнасці кадэтаў. У той жа час умацавалі свае пазіцыі прагрэсісты.

***Дзейнасць акцябрыстаў.*** Змены выбарчага закона ад 3 чэрвеня 1907 г. значна ўмацавалі пазіцыі акцябрыстаў. Яны разгарнулі шырокую кампанію па выбарах у III Дзяржаўную думу. Найбольш актыўна дзейнічаў Віцебскі аддзел «Союза 17 октября», які ўзначальваў вядомы літаратар У. Стукаліч. Ён жа кіраваў і Рускім перадвыбарчым камітэтам. Менавіта У. Стукаліч хадайнічаў перад П. Сталыпіным аб падзеле выбаршчыкаў у Дзяржаўную думу на нацыянальныя курыі. Вынікі дзейнасці Рускага перадвыбарчага камітэта былі даволі паспяховымі. Са 105 выбаршчыкаў губерні 65 (61,5 %) складалі члены СРН і «Союза 17 октября».

У Мінску 26 верасня 1907 г. адбыўся сумесны сход СРН і «Союза 17 октября», праваслаўных брацтваў пад старшынствам Г. К. Шміда, які вылучыў сваю кандыдатуру ў дэпутаты ад Мінска. Адзін з лідараў мінскіх акцябрыстаў, выкладчык моў у мужчынскай і жаночай гімназіях І. Я. Паўловіч заклікаў прысутных трымацца толькі Г. Шміда, які адзін варты паўсотні выбаршчыкаў. У далейшым І. Паўловіч стаў дэпутатам III Думы. У ходзе выбараў акцябрысты і РОС дабіліся абрання Г. Шміда дэпутатам Думы. Але пазней стала вядома яго крымінальнае мінулае (абвінавачванні і судзімасць за дзяржаўную здраду), і кіраўніцтва партыі акцябрыстаў адмежавалася ад Г. Шміда. Затым ён быў пазбаўлены і дэпутацкага мандата. У Дзяржаўную думу на месца Г. Шміда быў абраны рэктар Мінскай духоўнай семінарыі протаіерэй А. Д. Юрашкевіч[1].

Дзяржаўная дума III склікання пачала сваю працу 1 лістапада 1907 г. Чатыры дэпутаты ад беларуска-літоўскіх губерняў далучыліся да думскіх акцябрыстаў (А. П. Сапуноў, М. М. Еўраінаў, І. Я. Паўловіч, П. Г. Допельмаер). 15 лістапада 1907 г. урад унёс прапанову выбраць зямельную камісію ў складзе 66 чалавек для падрыхтоўкі праекта па ўказе ад 9 лістапада і прадстаўлення яго ў Думе. Адносіны акцябрыстаў да ўказа фактычна не адрозніваліся ад пазіцый крайне правых. Яны лічылі, што ўказ адкрые шлях да ўздыму сельскай гаспадаркі, адпаведна – да пашырэння ўнутранага рынку, развіцця гандлю і г. д. Акцябрысты тлумачылі, што ліквідацыя абшчыннага землеўладання і продаж надзельнай зямлі непазбежна пацягне за сабой пралетарызацыю сялянства, павялічыць колькасць дадатковых рабочых рук. Таму члены «Союза 17 октября» актыўна выступалі ў абарону сталыпінскай ініцыятывы. Акцябрыст І. Паўловіч заўважыў недахопы ўказа толькі ў рэдакцыйных хібах[2].

Складовай часткай сталыпінскай аграрнай рэформы было ўвядзенне мясцовага самакіравання ў Заходнім краі. На яго папярэднім абмеркаванні ў думскай

[1] Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі. – С. 179.
[2] Государственная дума. Стенографические отчеты. Созыв III. Сессня II. – С. 955.

камісіі ішлі дэбаты вакол нацыянальных курый. Акцябрысты, якія кіраваліся інтарэсамі землеўласнікаў, прапанавалі вызначыць колькасць земскіх гласных (абраных), зыходзячы толькі з аднаго паказчыка – працэнта вартасці нерухомых маёмасцей у паветах. З гэтай прычыны ў некаторых паветах беларуска-літоўскіх губерняў прадстаўніцтва польскіх землеўласнікаў склала б больш за 50 %, і камісія спынілася на пагубернскіх адносінах нерухомых маёмасцей, якія забяспечвалі перавагу «русской» курыі. У маі 1910 г. да абмеркавання законапраекта прыступіла Дума. П. Сталыпін абагульніў сутнасць урадавага праекта (курыяльная сістэма выбараў па нацыянальнасцях і прызначэнне на земскія пасады асоб рускага паходжання і інш.). У сакавіку 1911 г. выбарныя земскія ўстановы былі ўведзены ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях.

Сведчаннем антыпольскай і антыкаталіцкай накіраванасці дзейнасці акцябрыстаў заходніх губерняў было наладжванне з'ездаў заходнярускіх праваслаўных брацтваў. Першы з'езд адбыўся ў Мінску 29–31 жніўня 1908 г. Актыўную ролю ў яго правядзенні адыгралі мінскія акцябрысты Д. В. Скрынчанка, А. Н. Бяляеў, С. А. Някрасаў. Галоўнай тэмай іх выступленняў былі заклікі да барацьбы «с католнческой пропагандой н ополячиваннем белорусов». У пачатку жніўня 1909 г. у Вільні прайшоў другі брацкі з'езд. Разам з правымі манархістамі акцябрысты прынялі ў ім актыўны ўдзел.

К гэтаму часу адносіны паміж думскай фракцыяй акцябрыстаў і ўрадам пагоршыліся. Улады паступова пераарыентаваліся на Усерасійскі нацыянальны саюз. У сакавіку 1911 г. III Дума была распушчана, і старшыня Савета міністраў, адпаведна артыкулу 87 Асноўных законаў, правёў закон аб увядзенні выбарчага земства ў некаторых губернях Заходняга краю (у тым ліку Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай). У адказ на гэта лідар «Союза 17 октября» А. Гучкоў склаў з сябе паўнамоцтвы старшыні Дзяржаўнай думы. Дзеянні кіраўніка акцябрыстаў выклікалі абурэнне з боку мінскіх аднапартыйцаў. Апошнія цалкам падтрымлівалі нацыянальную ўрадавую палітыку і не жадалі далей быць у саюзе з асобамі, якія яе не прызнавалі. У маі 1911 г. на базе Мінскага аддзела «Союза 17 октября» быў адкрыты аддзел Усерасійскага нацыянальнага саюза, старшынёй якога стаў Д. Скрынчанка[1]. Пасля смерці П. Сталыпіна ў верасні 1911 г. пачаўся масавы выхад з партыі «Союз 17 октября». Паводле звестак Дэпартамента паліцыі ад 1912 г., у большасці губерняў аддзелы акцябрыстаў перасталі існаваць, а ў тых месцах, дзе арганізацыі дзейнічалі, яны, як правіла, уяўлялі мізэрныя па колькасці групы[2].

Напярэдадні выбараў у IV Дзяржаўную думу аддзелы існавалі толькі ў Магілёве і Гомелі. Яны здолелі правесці ў Думу старшыню Рагачоўскай павятовай земскай управы В. С. Дрыбінцава. Ад Віцебскай губерні ў Думу прайшоў ак-

---

[1] Минский С. Открытие минского отдела «Всероссийского национального союза» // Белорус. жизнь. – 1911. – 24 мая. – С. 2.

[2] Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі. – С. 191.

цябрыст, член Дзяржаўнай думы III склікання, гласны губернскага і павятовага земстваў М. Еўраінаў. У час працы IV Думы да фракцыі акцябрыстаў далучыўся і прадстаўнік ад Магілёўскай губерні Б. А. Энгельгарт.

У 1913 г. у Пецярбургу адбыўся апошні Усерасійскі сход «Союза 17 октября». Ад 5 заходніх губерняў у ім прынялі ўдзел 10 дэлегатаў (у тым ліку А. Сапуноў, У. Стукаліч, М. Друцкі-Сакалінскі і інш.). Пасля сходу ў снежні 1913 г. думская фракцыя «Союза 17 октября» раскалолася на групы беспартыйных, земцаў-акцябрыстаў і левых акцябрыстаў. Гэта прывяло да канчатковага распаду партыі на перыферыі. У 1914–1915 гг. яе структуры па-за Дзяржаўнай думай спынілі існаванне.

Падтрымка з боку ўрада дапамагла партыі акцябрыстаў і «Русскому окраинному союзу» стаць самымі ўплывовымі грамадска-палітычнымі групоўкамі ў беларуска-літоўскіх губернях. Яны праводзілі сваіх дэпутатаў у III і IV Думы і мелі магчымасць ажыццявіць свае праграмныя патрабаванні. Разам з манархічнымі арганізацыямі «Союзу 17 октября» ўдалося дабіцца змены сістэмы выбараў у Дзяржаўны савет ад заходніх губерняў (значна павялічыўшы прадстаўніцтва ад праваслаўнага насельніцтва), а таксама правесці праз Думу сталыпінскі варыянт увядзення выбарных земстваў на тэрыторыі Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў (нацыянальныя курыі). Канчаткова перайсці ў мясцовыя арганізацыі Усерасійскага нацыянальнага саюза многіх акцябрыстаў падштурхнула дзейнасць цэнтральнага кіраўніцтва «Союза 17 октября» (у прыватнасці, А. Гучкова), бо, на іх думку, яны дапускалі саступкі палякам.

***Заходнерусізм: ідэалогія і арганізацыйная актыўнасць.*** У грамадска-палітычным жыцці беларуска-літоўскіх губерняў пачатку XX ст. важную ролю адыгрывалі суполкі, якія знаходзіліся на пазіцыях заходнерусізму і разглядалі беларусаў як частку адзінага рускага народа. Некаторыя заходнярусы арыентаваліся на правыя партыі («Союз русского народа», Усерасійскі нацыянальны саюз і інш.), іншыя займалі пазіцыі, блізкія да ліберальных партый (канстытуцыйна-дэмакратычная партыя, «Союз 17 октября»).

У сакавіку 1906 г. быў зацверджаны статут таварыства «Крестьянин». Суполка праваакцябрысцкага толку на чале з выкладчыкам гімназіі С. А. Кавалюком пачала дзейнічаць у Вільні (орган друку – часопіс «Крестьяннн»). Галоўны рэдактар апошняга – А. С. Уруцэвіч быў намеснікам старшыні таварыства. Нацыянальнае і аграрнае пытанні, як і было абвешчана, сталі галоўнымі кірункамі ў дзейнасці арганізацыі[1].

У 1906–1907 гг. адбываецца прыкметная эвалюцыя «Крестьяннна». Рэзкі ўхіл управа вымусіў шэраг былых прыхільнікаў, у асноўным з дэмакратычных гарадскіх пластоў, стварыць уласнае аб'яднанне «Белорусское общество». У ліпені 1908 г. Віленскі губернатар зацвердзіў яго статут. Старшынёй стаў

[1] Документы общероссийских партий и организаций либерального направления в Беларуси (1905–1918 гг.). – С. 261.



Аляксей Сапуноў, акцябрыст, дэпутат III Дзяржаўнай думы ад Віцебскай губерні

Л. М. Саланевіч, яго наместнікам – П. В. Каранкевіч, сакратаром – П. І. Каранеўскі. Усе працавалі ва ўпраўленні Палескіх чыгунак у Вільні.

На палітычнай арэне «Белорусское общество» арыентавалася на «Союз 17 октября». На з'ездзе, які адбыўся ў кастрычніку 1909 г., Л. Саланевіч падкрэсліў, што ў задачу акцябрыстаў павінны ўвайсці клопаты аб падтрымцы нацыянальных, рэгіянальных і эканамічных інтарэсаў беларусаў, паколькі ўрадавых мерапрыемстваў «уже недостаточно»[1].

З 1 студзеня 1911 г. пачалося выданне газеты «Белорусская жизнь», на старонках якой у першую чаргу змяшчаліся матэрыялы аб культурна-асветніцкім жыцці Віленшчыны і ролі ў ім «Белорусского общества». У жніўні выйшаў апошні иумар газеты. Л. Саланевіч пачаў выдаваць уласную газету «Северо-Западная жизнь» і адышоў ад спраў таварыства. І толькі напярэдадні выбараў у IV Дзяржаўную думу, у чэрвені 1912 г., старшыня праўлення «Белорусского общества» П. Каранкевіч і яго наместнік М. А. Баўдзей наладзілі выданне новага друкаванага органа – «Белорусского вестника». Але правесці дэпутата ў Думу ў вострым супрацьстаянні з мясцовымі прагрэсістамі, Усерасійскім нацыянальным саюзам, Святадухавым брацтвам, крайне правымі таварыству не ўдалося. У пачатку 1913 г. «Белорусский вестник» спыніў існаванне.

Яшчэ ў лютым 1909 г. у закліку «К белорусской иителлигенцни» Л. Саланевіч пісаў аб тым, што менавіта ад яе будзе залежаць, ці будуць беларусы на розных славянскіх з'ездах, у Дзяржаўным савеце і ў Дзяржаўнай думе гаварыць самі за сябе, ад свайго імя, ці гэта будуць рабіць: велікарускія чыноўнікі Г. Г. Замыслоўскі (наместнік пракурора Віленскай судовай палаты, член СРН), В. К. Тычынін (інспектар народных вучылішчаў), І. Я. Паўловіч (выкладчык моў мужчынскай і жаночай гімназій у Мінску); свяшчэннік А. С. Вяраксін (старшыня Глыбоцкага аддзела СРН; актыўны ўдзельнік Рускага народнага саюза імя Міхаіла Архангела) і ксёндз С. Г. Мацэевіч (адзін з прыхільнікаў Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі і актыўны ўдзельнік Польскай нацыянальна-дэмакратычнай партыі); ці такія прадстаўнікі дваранства, як І. С. Монтвіл (віленскі банкір, дэпутат III Дзяржаўнай думы і старшыня фракцыі «Польска-літоўска-беларускае кола») і Г. Р. Патоцкі (дэпутат II Думы, член Дзяржаўнага савета ў 1908–1912 гг.).[2]

Лідары «беларускай партыі» так і не здолелі правесці сваіх дэпутатаў у вышэйшыя заканадаўчыя і прадстаўнічыя ўстановы. Адна з прычын была

[1] Партня «Союз 17 октября». Протоколы съездов, конференцнй и заседаний ЦК. – М., 2000. – Т. 2. – С. 112.

[2] К белорусской ннтеллигенции // Белорус. жизнь. – 1909. – 9 февр. – С. 1–2.


Эдвард Роп, кіраўнік Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі

ў слабасці мясцовых лібералаў, у першую чаргу – фінансавай. Адсюль істотная залежнасць ад агульнарасійскіх партый кадэтаў, акцябрыстаў і інш., а таксама ўнутрыпартыйныя супярэчнасці. У першую чаргу яны прасочваюцца ў дзейнасці С. Кавалюка і Л. Саланевіча.

Неабходна акцэнтаваць увагу і на своеасаблівых умовах, у якіх праходзілі выбары ў Думу ад Віленскай губерні. Існаванне «русской» курыі пазбаўляла беларусаў магчымасці атрымаць дэпутацкі мандат. Супрацьстаяць заможным палякам, з аднаго боку, і велікарускім шавіністам – з другога, было складана. Аб гэтым становішчы мясцовага насельніцтва заяўляў у «Открытом лпсте» членам III Дзяржаўнай думы і рускаму таварыству «У нас своя Босния» (1908 г.) Д. Скрынчанка. Ён лічыў, што на гэтай тэрыторыі не засталося «тутэйшага» ні дваранства, ні дробнай шляхты, ні купецтва, якія б не былі акаталічаны і апалячаны. Карэннае рускае дваранства, на яго думку, даўно знікла пад ударамі пальшчызны, а мясцовай рускай інтэлігенцыі тут няма. Рускія толькі «поп да хлоп». «Хлоп» цёмны і забіты, «поп» адзін нясе на сабе адказнасць за рускую справу, цяжкую місію нацыянальнага абуджэння. Далей святар акцэнтаваў увагу на націску каталіцызму і паланізму. І тым не менш, як адзначаў Д. Скрынчанка, тут у канцы XIX – пачатку XX ст. захаваўся беларускі народ, нягледзячы на 400-гадовае польскае іга; вяртанне тутэйшага народа да рускай самасвядомасці – гэта не палітыка абрусення, тут і так Русь, як, напрыклад, у Пензе, яна тут толькі пакрыта польскім лакам, і яго неабходна зняць[1].

Аналіз дзейнасці кіраўнікоў і прадстаўнікоў інтэлігенцыі і чыноўнікаў, а таксама прадстаўнікоў заможнай часткі беларускіх сялян, якія арыентаваліся на саюз з царскім урадам і лічылі галоўнай задачай «развіццё ў беларускай народнасці самасвядомасці на асновах рускай дзяржаўнасці», як адзначаў А. І. Цвікевіч, «не пакідае ніякага сумнення ў тым, што ў іхняй “западно-русской” свядомасці, у іхняй псіхалогіі жылі дзве істоты: адна мясцовая – беларуская і другая агульна-расійская»[2].

Акрамя вышэйузгаданых «западнорусскнх» груповак палітычнага характару, сярод заходнярусаў было шмат асоб, якія галоўнай мэтай ставілі культурна-асветніцкую дзейнасць[3]. Да іх ліку адносіцца А. Сапуноў, сакратар Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, у якім ён выкладаў у 1911–1912 гг. Сапуноў даследаваў гісторыю, археалогію, этнаграфію. Самая буйная яго праца – зборнік дакументаў «Витебская старнна» (т. 1, 4–5, 1883–

[1] Скрынченко Д. В. Трагедня белорусского народа. – Мннск, 1908. – С. 1–7.
[2] Цвікевіч А. «Западно-руссізм» : нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX ст. – Мінск, 1993. – С. 322.
[3] Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 4. – С. 392.

1888). У сваёй прамове на пасяджэнні Дзяржаўнай думы 30 мая 1909 г. А. Сапуноў тлумачыў дэпутатам, што мы, праваслаўныя беларусы, як і ўсе рускія Заходняга краю, выступаем супраць неабгрунтаваных, на наш погляд, імкненняў палякаў на наш рускі край. Мы гаворым «русский край», паколькі беларуская народнасць – адна з асноўных народнасцей рускага племя. На пасяджэнні Думы 11 мая 1910 г., аналізуючы «культурную работу» палякаў у Заходнім краі, А. Сапуноў адзначыў, што беларускаму народу неабходна вылучыць з недраў сваіх моцны культурны элемент, і, бясспрэчна, народ яго вылучыць, толькі б не станавіліся ўпоперак яго шляху няпрошаныя бацькі[1].

Пошук самастойнасці нацыянальнай культуры беларускага народа, яго права на самасцвярджэнне быў галоўнай тэмай навуковай дзейнасці беларускага археолага, этнографа, краязнаўцы Е. Р. Раманава. Ён быў правадзейным членам шматлікіх навуковых таварыстваў, рэдактарам аддзела газеты «Могилевские губернские ведомости», з 1910 г. загадчыкам секцыі этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства. Е. Раманаў выдаў самую вялікую па колькасці беларускіх фальклорных тэкстаў работу – «Белорусский сборник» (вып. 1–9, 1886–1912). Гэтае выданне – своеасаблівая энцыклапедыя беларускай народнай творчасці. Неабходна адзначыць даследчыкаў М. Я. Нікіфароўскага, А. К. Сержпутоўскага, Я. Ф. Карскага і многіх іншых, якія ў рознай ступені былі прыхільнікамі «заходнярускай канцэпцыі», але ўнеслі вялікі навуковы ўклад у вывучэнне спецыфікі культуры беларускага краю ў вызначаны час.

***Партыі сацыялістычнай арыентацыі.*** Скліканая 21–23 чэрвеня 1907 г. для абмеркавання тактычных пытанняў у сувязі з трэцячэрвеньскім пераваротам III канферэнцыя РСДРП (II Агульнарасійская) канчаткова вызначыла тактыку бальшавікоў у перыяд выбараў. Па пытанні магчымых выбарчых блокаў III канферэнцыя РСДРП указала, што пры пагадненнях сацыял-дэмакраты павінны кіравацца размеркаваннем несацыялістычных партый па ступені іх дэмакратызму ў наступнай паслядоўнасці: 1) сацыялісты-рэвалюцыянеры; 2) народныя сацыялісты; 3) трудавікі; 4) кадэты. Прычым адзначалася, што на пачатковай стадыі выбараў сацыял-дэмакратыя выступае на выбарах самастойна, не заключаючы выбарчыя пагадненні (пры паўторнай балаціроўцы дапускаліся пагадненні з усімі партыямі, што былі больш левыя, чым кадэты). Такім чынам, у першую чаргу прадугледжвалася магчымасць стварэння блока з эсэрамі. Далей ішла партыя «народных сацыялістаў», затым – трудавая група і, нарэшце, кадэты. Пры гэтым падкрэслівалася, што выступаць разам з кадэтамі можна толькі ў тым выпадку, калі ў выніку выбарчай кампаніі не ўдалося атрымаць неабходнай большасці, і каб перамагчы чарнасоценцаў і акцябрыстаў[2].

---

[1] Сапунов А. П. Речи в Государственной думе 3-го созыва. – СПб., 1912. – С. 33–41.

[2] Гусев К. В., Полушкина В. А. Стратегия и тактика большевиков в отношении непролетарских партий. – М., 1983. – С. 80.

Кіруючыся рашэннямі III канферэнцыі, арганізацыі РСДРП пачалі рыхтавацца да выбараў. Між тым улетку 1907 г. былі разгромлены ці аслаблены набегамі паліцыі партыйныя арганізацыі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Оршы, Магілёве, Смаргоні, Мазыры, Пінску і іншых гарадах. Да канца верасня 1907 г. пры дапамозе ЦК партыі была адноўлена і разгарнула актыўную дзейнасць Мінская група РСДРП. Начальнік Мінскага ахоўнага аддзялення ў кастрычніку дакладаў у дэпартамент паліцыі, што асабліва сур'ёзнай увагі патрабуе Мінская арганізацыя РСДРП. Яе члены аказвалі дапамогу ў наладжванні агітацыйнай работы партыйным групам Бабруйскага, Слуцкага, Навагрудскага, Барысаўскага і Рэчыцкага паветаў.

ЦК РСДРП падтрымліваў пастаянную сувязь з мясцовымі партыйнымі арганізацыямі ў заходніх губернях. 6 верасня 1907 г. Віленская арганізацыя РСДРП атрымала з Пецярбурга 15 фунтаў пракламацый «Избпрательная платформа РСДРП». У ёй гаварылася, што хто разагнаў II Думу і здзейсніў 3 чэрвеня 1907 г. пераварот, той забраў у сялян, рабочых і гарадской беднаты большую частку тых мізэрных выбарчых правоў, якімі яны валодалі. Гэта зрабіў урад, які падтрымліваюць усе правыя партыі – «Союз русского народа», акцябрысты і інш. У гэтым дакуменце бальшавікі заклікалі працоўных весці барацьбу не толькі з самадзяржаўем, рэакцыйным урадам, правымі партыямі, але і са здрадніцкай палітыкай ліберальных партый. У лістападзе 1907 г. прадстаўнікі Пецярбургскага I камітэта РСДРП наведалі з агітацыйнымі мэтамі некалькі гарадоў Паўночна-Заходняга краю, у тым ліку Гродна.

Галоўнай формай работы партыйных арганізацый у масах былі вусная прапаганда і распаўсюджванне лістовак. За захоўванне нелегальнай літаратуры ў чэрвені 1907 г. асудзілі селяніна вёскі Дукоркі Ігуменскага павета Мінскай губерні А. Гуло. Склады рэвалюцыйнай літаратуры былі захоплены паліцыяй у Віленскім павеце. У верасні за распаўсюджванне пракламацый РСДРП, у тым ліку і «Избирательной платформы РСДРП», у Лоеве Рэчыцкага павета былі арыштаваны Б. Фейгін, Ш. Хракоўскі і інш. Ячэйкі Мінскай акруговай сялянскай арганізацыі пры РСДРП у другой палове 1907 г. вялі агітацыйную дзейнасць у вёсках Навагрудскага і Ігуменскага паветаў. Распаўсюджваннем пракламацый РСДРП у ліпені займалася сялянская арганізацыя ў мястэчку Нова-Свянцяны Віленскай губерні.

III з'езд партыі эсэраў, які адбыўся ў ліпені 1907 г., канстатаваў, што тыя прычыны, якія выклікалі рэвалюцыю, захоўваюцца, і новы рэвалюцыйны выбух непазбежны. Эсэры лічылі, што падзеі 3 чэрвеня вярнулі краіну да дарэвалюцыйнага стану. Дзяржаўная дума, выбраная па новым выбарчым законе, ацэньвалася імі як дэкарацыя ранейшага самадзяржаўна-паліцэйскага рэжыму, як канстытуцыйная фікцыя. Адсюль рабілася выснова: усё трэба «начннать сначала» і вярнуцца да ранейшых форм, метадаў і сродкаў барацьбы. Савет партыі прыняў рашэнне байкатаваць III Дзяржаўную думу.

Цэнтральны орган партыі эсэраў, газета «Знамя труда», пісала, што да выбараў неабходна стаць спіной, неабходна дабіцца, каб спіной да іх стаў і народ,

і ўсе свае сілы выкарыстаў на падрыхтоўку да новай настойлівай барацьбы. Эсэры сцвярджалі, што ісці ў III Думу было б лагічным толькі для тых, хто страціў веру ў рэвалюцыю. Усіх праціўнікаў байкоту эсэры абвясцілі здраднікамі. Газета «Знамя труда» пісала, што няхай іншыя партыі, групы адна за адной сыходзяць з рэвалюцыйнага шляху, на якім яны раней імкнуліся стаяць. Наша партыя, заняўшая мужна гэту пазіцыю, першая агаліла меч для адкрытай барацьбы, не мае ніякіх падстаў змяняць курс і плыць па цячэнні.

Газеты «Земля и воля», «Знамя труда» ў шэрагу нумароў за ліпень–кастрычнік 1907 г. змяшчалі артыкулы, якія пераконвалі сялян у неабходнасці байкатаваць выбары. «Земля и воля» пісала, што III Дума патрэбна цару для таго, каб атрымаць займы ад замежных банкіраў і лепей дамовіцца з дваранамі і фабрыкантамі. А сялянам удзельнічаць у гэтай гульні непатрэбна[1]. Тым больш, што ў сялян адабрана права выбіраць свайго дэпутата на карысць дваран-памешчыкаў, як адзначала 3 ліпеня газета «Знамя труда».

У пачатку ліпеня 1907 г. адбыўся VII з'езд Паўночна-Заходняй арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Мінскай, Віцебскай, Смаленскай і Гродзенскай губерняў. У прынятай на з'ездзе рэзалюцыі па пытанні аб адносінах да выбараў у Думу адзначалася, што паколькі па новым выбарчым законе сацыялістычныя партыі пазбаўлены магчымасці перашкодзіць тактыцы ўрада і III Дума не можа быць выкарыстана ў сэнсе агітацыі і арганізацыі шырокіх народных мас, то ў адносінах да выбараў неабходна прымяняць тактыку байкоту. З'езд заклікаў партыйныя арганізацыі не губляць час на дарэмны і нават шкодны для народа ўдзел у Думе. У звароце Паўночна-Заходняга абласнога камітэта «Да сялян!» указвалася, што не царскія Думы дадуць сялянам зямлю і волю, а толькі Устаноўчы сход, абраны ўсеагульным тайным галасаваннем пасля звяржэння самадзяржаўя[2].

Выконваючы рашэнні VII з'езда партыі, кур'еры прыступілі да распаўсюджвання нелегальнай агітацыйнай літаратуры, якая выдавалася ў Вільні і Мінску, паступала праз транспартную кантору «Надежда» з Пецярбурга і іншых гарадоў. У чэрвені 1907 г. у Вільні пры вобыску паліцыя знайшла друкарскі станок, касы са шрыфтам, каля 10 пудоў друкарскага шрыфту, 2834 надрукаваныя экзэмпляры адозвы «Отношение к Государственной думе» партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Улетку 1907 г. за прыналежнасць да партыі эсэраў і распаўсюджванне партыйнай літаратуры ў Мінскай губерні быў арыштаваны чыноўнік Р. Чапрацкі.

5 кастрычніка ў Віцебску на чыгуначным вакзале былі затрыманы паліцыяй два выхаванцы духоўнай семінарыі з багажом каля двух пудоў, прысланым са Смаленска. У цюку знаходзіліся заклікі «К солдатам и рабочим!» партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Пры вобыску падвальнага памяшкання семінарыі было

---

[1] На западных окраннах // Минское слово. – 1907. – 7 окт. – С. 2.
[2] ДАРФ. – Ф. 102. Воп. 137. Спр. 9 (ч. 2). – Арк. 131.

знойдзена яшчэ 8 пудоў нелегальнай літаратуры[1]. Па звестках дэпартамента паліцыі, ваенна-рэвалюцыйная арганізацыя камітэта партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў у кастрычніку 1907 г. дзейнічала ў Вільні і Лідзе. Яна мела склад зброі з 27 рэвальвераў і вяла агітацыю ў войсках.

Між тым, па даных «Земли и воли», з 14 тысяч валасцей імперыі, уключаных у выбарчую кампанію, сяляне толькі 928 адмовіліся прыняць удзел у выбарах. У беларуска-літоўскіх губернях энэсаўскія арганізацыі не існавалі. Канстатуючы глыбокія ідэйна-тэарэтычныя і тактычныя рознагалоссі паміж бальшавікамі, меншавікамі, бундаўцамі, эсэрамі і энэсамі, неабходна падкрэсліць, што ўсе гэтыя партыі адносіліся да рэвалюцыйнага лагера, выступалі супраць царызму, з большай ці меншай паслядоўнасцю абаранялі інтарэсы працоўных. У III Думу ім не ўдалося правесці ні аднаго дэпутата. Стратэгія і тактыка ліберальных, пранароднiцкіх і сацыяльна-дэмакратычных партый у пострэвалюцыйны перыяд вызначаліся іх ацэнкамі характару трэцячэрвеньскай манархіі, палітычнай сітуацыяй у краіне, перспектывамі новай рэвалюцыі.

Выбары у IV Дзяржаўную думу, пашырэнне рабочага руху, сялянскія хваляванні 1911–1912 гг. зноў актывізавалі дзейнасць практычна ўсіх палітычных партый. Аднак частка эсэраў не змяніла думскую тактыку. Дзяржаўная дума, абраная па новым выбарчым законе, разглядалася імі як канстытуцыйная фікцыя. Групы сацыялістаў-рэвалюцыянераў у беларускіх губернях да 1912 г. практычна не дзейнічалі. Іх імкнуліся выявіць прадстаўнікі ЦК партыі, якія былі камандзіраваны на Гродзеншчыну і Віленшчыну. Супрацоўнікі губернскіх жандарскіх упраўленняў не змаглі затрымаць раз'яднаных агентаў, і дакладная інфармацыя аб уцалелых членах у справаздачах дэпартамента паліцыі адсутнічала. У красавіку 1912 г. дэпартамент паліцыі запатрабаваў ад начальнікаў раённых ахоўных аддзяленняў неадкладна пачаць агентурныя высвятленні выклікаючых падазронасць элементаў сярод сялянства і настаўніцкага асяроддзя ў вёсках[2]. Намаганні паліцыі зноў былі безвыніковымі.

Пражская канферэнцыя бальшавікоў (1912 г.) абавязала партыйныя арганізацыі па рабочай курыі выстаўляць сваіх кандыдатаў і не дапускаць ніякіх пагадненняў з іншымі партыямі, у тым ліку і з меншавікамі, па другой гарадской і сялянскіх курыях, каб не прапусціць чарнасоценных кандыдатаў. Удзельнікі канферэнцыі прызналі неабходным пры перабалаціроўках дапускаць пагадненні з лібераламі. Пры гэтым не дапускалася выстаўленне агульнай платформы і якіх-небудзь палітычных абавязкаў.

У сакавіку 1912 г. бальшавікі пачалі распаўсюджваць пракламацыю «Избирательная платформа РСДРП». У ёй адзначалася, што партыя ідзе ў Думу для таго, каб з думскай трыбуны тлумачыць ідэі сацыялізму, раскрываць падман лібералаў, заклікаць масы да барацьбы. У платформе абвяшчаліся

[1] По Северо-Западному краю // Могилевский вестник. – 1907. – 9 октября. – С. 4.
[2] НГАБ у г. Гродне. – Ф. 369. Воп. 1. Спр. 76. Арк. 4–11.

лозунгі дэмакратычнай рэспублікі, 8-гадзіннага дня і канфіскацыі памешчыцкіх зямель.

У перыяд новага рэвалюцыйнага ўздыму аднавілі сваю дзейнасць сацыял-дэмакратычныя гурткі і раённыя арганізацыі ў Палескім рэгіёне. Яны наладзілі рэгулярныя сувязі з ЦК РСДРП, а 3 мая 1912 г. назвалі сябе Палескім камітэтам. Пасля VI Усерасійскай канферэнцыі РСДРП расшыраны сход арганізацый Палескага раёна разам з Аршанскай, Віцебскай і Мінскай арганізацыямі РСДРП адхілілі платформу ліквідатараў і ўхвалілі рашэнні канферэнцыі[1].

У Гомелі, Мінску, на Палессі ўмацаванню пазіцый РСДРП садзейнічала распаўсюджванне газеты «Правда». У ходзе выбарчай кампаніі ў IV Думу Палескі камітэт выступіў самастойна і значна ўплываў на працоўныя масы. У далейшым яму ўдалося нават правесці выбаршчыкам рабочага па гарадской курыі Гомеля.

У заходніх губернях шырока распаўсюджваліся лістоўкі РСДРП, прысвечаныя выбарчай кампаніі. У адной з іх, знойдзенай паліцыяй у Гродне і Вільні, гаварылася, што прайшло пяць гадоў, калі Мікола Крывавы, цар Хадынскі, знішчальнік I і II Дзяржаўных дум, адкінуў свае абяцанні і маніфесты і разам з чорнай сотняй абшарнікаў, разам з акцябрыстамі пачаў помсціць рабочаму класу і ўсім рэвалюцыйным элементам Расіі. Выбірайце ў Думу тых, хто будзе з думскай трыбуны заклікаць масы да барацьбы. Раскрывайце ўрадавы падман, рыхтуйце свядомых байцоў новай рускай рэвалюцыі[2].

Адносіны да расійскага самаўладдзя, аграрнае, нацыянальнае, рабочае і іншыя пытанні былі ў цэнтры ўвагі палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі ў трэцячэрвеньскі перыяд. Яны знайшлі адлюстраванне ў час выбарчых кампаній, калі палітычныя партыі дзейнічалі найбольш актыўна, а таксама пры абмеркаванні ў Думе адукацыйных, канфесійных, аграрнага і іншых законапраектаў. Аналіз выступленняў у Дзяржаўнай думе дэпутатаў ад беларуска-літоўскіх губерняў, рэакцыя на іх публічныя заявы ў агульнарасійскім і мясцовым перыядычным друку дазваляе яскрава вызначыць спецыфіку і асаблівасці палітычнай барацьбы ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губернях, а таксама ўмовы, у якіх развіваўся беларускі нацыянальны рух напярэдадні Першай сусветнай вайны.

---

[1] Кароль А. С. Арганізацыі РСДРП у Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1993. – Т. 1. – С. 146.

[2] Забаўскі М. М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі. – С. 194.